Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНОГО ЗНАНИЯ

Материалы III Международной студенческой
научно-теоретической конференции

Минск, 18 апреля 2018 г.

Минск
РИВШ
2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 378.14:30(061.3)
ББК 74.58:60
А43

Р е к о м е н д о в а н о
советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 8 от 29 марта 2018 г.)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат педагогических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

А43 **Актуальные** проблемы социально-гуманитарного знания : материалы III Междунар. студ. науч.-теорет. конф., Минск, 18 апр. 2018 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]; Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск : РИВШ, 2018. – 246 с.

ISBN 978-985-586-129-5.

В сборнике представлены материалы исследований молодых ученых высших учебных заведений Республики Беларусь и Российской Федерации, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные актуальным проблемам исторических, педагогических и социально-гуманитарных научных дисциплин.

Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 378.14:30(061.3)**
**ББК 74.58:60**

**ISBN 978-985-586-129-5**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

школы, духовного училища и духовной семинарии, чинно выстроенные по 5 человек в ряд, затем два хора певчих – архиерейский и семинарский, иконы и духовенство, с преосвященным Сергием во главе. Певчие чередовались в пении «Спаси Господи» и «Пречистому Твоему Образу», два хора военной музыкиво все время по пути исполняли «Коль Славен». Весь путь был усыпан еловыми и дубовыми ветками. Собрание молящихся, а также любопытствующих евреев и католиков было громадно: улицы, тротуары, подъезды, театральные и соборные площади, окна и заборы – переполнены были народом. Перед собором, на особо воздвигнутой и убранной зеленью эстраде, совершенно было молебствие, с провозглашением многолетия Царствующему дому, Святейшему Синоду, правительствующему синклиту и воинству. Перед молебном, сам Преосвященниший Сергий огласил послание Святейшего Синода. По окончании молебна, процессия тем же порядком возвратилась снова в братский монастырь. [3, с.754]

Вечером, в 6 часов 30 минут, в зале классической гимназии, состоялось чтение, исключительно посвященное воспоминаемому событию.Преподаватель духовной семинарии И.П. рассказал об истории унии в Могилевском крае. В кратком и живом очерке лектор ясно изложил главные фазы развтития унии в Могилевской губернии, притеснения православных их меры обороны против унии, их постоянное и неуклонное стремление к слиянию с православием до Иосифа Семашки. Затем другой преподаватель семинарии А.С. прочитал свою речь о главном деятеле воссоединения митрополите Иосифе Семашко. Интересное и живое чтение ораторов выслушано было с глубоким вниманием и заслужило полное одобрение собравшейся публики в большом количестве. Чтение удостоили своим посещением преосвященнийщий Сергий и начальник губернии. Закончился вечер в гимназии пением соединенных хоров – архиерейкого и гимназического – «Спаси Господи» и гимна «Боже Царя храни», сопровождавшегося каждый раз громким «Ура» и повторением до 4-рех раз. [3, с.754]

Вообще празднование удалось вполне и с внешней стороны прошло блестяще, чему способствовало сочувствие и полное единодушие всех слоев общества и местной власти. Так же особую роль в празднованиях занимали Епархиальные Ведомости, заранее подготовившие жителей Могилевской губернии к знаменательному торжеству. В Епархиальных Ведомостях был размещен ряд статей, знакомивших с общим ходом воссоединения униатов в 1839 году, в ближайшем торжеству номере, был напечатан реестр церквей, которые в разное время были переданы насильно в унию, который был заимствован из истории унии Бантыш-Каменского, наконец, перед самым празднованием был выпущен номер, в котором помещена статья о трудах Василия Лужинского в деле воссоединения униатов по Могилевской губернии. Такая заботливость вполне отвечает важности события: в Могилевской губернии в 1839 году было воссоединено 205 церквей. [3, с.754]

Если подводить итоги празднования 50-летия Полоцкого собора, то можно сказать о всесословном участии всего населения, так же хочется отметить высокую подготовку к торжеству, которую осуществила гражданская и духовная власть в единомыслии. Все население было очень радо богослужениям и мероприятиям, которые были проведены.

*Литература*

1. “Празднование в Витебске”. // Прибавления к Церковным Ведомостям. - 1889. - №26. – С. 757-758
2. “Празднование в Минске”. // Прибавления к Церковным Ведомостям. - 1889. - №26. – С. 755-757
3. “Празднование в Могилеве”. // Прибавления к Церковным Ведомостям. - 1889. - №26. – С. 754

## КРЭПАСЦЬ БРЭСТ-ЛІТОЎСК У КАНЦЫ XVIII–XIX СТ.

*Г.І. Пекарэц, 3 курс, БДПУ, Мінск*
*навук. кір. – А.А. Корзюк, канд. пед. навук, дац., БГПУ*

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай ў сувязі з неабходнасцю ўмацавання заходніх рубяжоў Расіі царскі ўрад пачаў ажыццяўляць ідэю стварэння на месцы старога горада Брэст-Літоўска магутнай фартэцыі, якая б змагла служыць апорным пунктам для дзеючай арміі ў гэтым раёне. Усяго на заходняй граніцы меркавалася ўзвесці дзевяць магутных крэпасцей першай лініі, у тым ліку крэпасць Брэст-Літоўск [1, с. 31].

У 1796 г. інжынер-генерал К. І. Оперман склаў інструкцыю «Для агляду новай мяжы з Прусіяй і Аўстрыяй», дзе выказаў меркаванне аб выкарыстанні Брэст-Літоўска ў якасці месца для пабудовы крэпасці. Хутка на разгляд было прадстаўлена некалькі праектаў крэпасцей. Першы праект у 1797 г. падрыхтаваў інжынер-генерал Дэвалан, потым ішлі праекты інжынераў Сухтэлена ў 1807 г., Малецкага ў 1823 і 1827 гадах і іншыя. Канчатковае рашэнне аб будаўніцтве Брэст-Літоўскай крэпасці з'явілася ў пачатку 1829 г. У красавіку К. І. Оперман па загадзе цара пасылае будаўніка ўмацаванняў інжынер-палкоўніка А. І. Фельдмана для ўзгаднення праектаў крэпасці з мясцовасцю і для праектавання ўмацаванняў.

У 1829 г. камітэт па будаўніцтве на чале з інжынер-генералам К. І. Оперманам прадставіў праект абарончай лініі «Брэст-Літоўск» часо¬вага профілю, які потым можна было б перадварыць у доўгачасовы. На будаўніцтве крэпасці на працягу двух гадоў меркавалася штодзённа залучаць

1000 сапёраў, 7000 салдат і 1000 коней [2, с. 148]. У кастрычніку 1830 г. гэты праект, аўтарам якога былі ваенныя інжынер-генералы Малецкі, К. І. Оперман і палкоўнік А. Фельдман, з некаторымі папраўкамі зацвердзіў імператар Мікалай І. Быў створаны будаўнічы камітэт, падначалены Малецкаму, інжынернай камандай кіраваў Фельдман. Агульнае кіраўніцтва будаўніцтвам ажыццяўляў генерал-маёр І. І. Дэн.

У 1832 г. царскі ўрад запатрабаваў, не чакаючы зацвярджэння дэталізаваных чарцяжоў, прыступіць да нарыхтоўкі неабходных для работы матэрыялаў, на што было адпушчана 500 000 рублёў, а праз два месяцы запатрабаваў справаздачу: якія па гэтаму пытанню зроблены распараджэнні і калі прыступяць да саміх работ. З 1832 г. найвышэйшы нагляд за будаўніцтвам крэпасці быў ускладзены на генерал-фельдмаршала Ф. І. Паскевіча. 6 чэрвеня 1833 г. пачаліся масавыя земляныя работы, часова спыненыя пажарам, які знішчыў частку горада. У сувязі з пабудовай крэпасці, горад быў перанесены амаль на 3 км на ўсход.

Пасля падаўлення нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 г. і распачатых ганенняў на каталікаў і уніятаў, вялікую колькасць брэсцкіх кляштараў чакала скасаванне. Некаторыя мураваныя пабудовы былі прыстасаваны для патрэб крэпасці, іншыя зусім спынілі існаванне. Пацярпелі ад пажараў і былі разабраны каталіцкія кляштары аўгусцінцаў, дамініканцаў, трынітарыяў, прыходскі касцёл і мураваная Свята-Мікалаеўская царква, у якой у 1596 г. была абвешчана Брэсцкая унія. Акрамя таго, перасталі дзейнічаць знакамітая на ўсю Еўропу сінагога, праваслаўны Сімяонаўскі манастыр, былыя праваслаўныя, а затым уніяцкія драўляныя цэрквы: Троіцкая, Міхайлаўская, Праабражэнская [1, с. 31; 2, с. 149].

Да 1836 г. земляныя работы былі ў асноўным завершаны, і крэпасць, абарончая лінія якой складалася з шэрагу бастыённых фартоў з равелінамі, дзялілася Бугам і Мухаўцом на Кобрынскае, Валынскае, Цярэспальскае ўмацаванні і ўяўляла сабой ужо трывалы апорны пункт. Па акружнасці вострава, які знаходзіўся ў цэнтры ўмацаванняў, прыступілі да пабудовы двухпавярховай абарончай казармы, якая стварыла Цытадэль.

Па традыцыі, 1 (14) чэрвеня 1836 г. былі ўрачыста замураваны ў падмурак абарончай казармы куфэрак з 21 манетай (2 залатыя, 13 срэбраных, 5 медных, 1 плацінавая) і бронзавая пліта з надпісам. Гэтыя унікальныя рэліквіі былі знойдзены ў красавіку 1953 г. у час разборкі завалаў Цытадэлі ў раёне Брэсцкай брамы і зараз захоўваюцца ў Брэсцкім краязнаўчым музеі [1, с. 32]. На закладной дошцы чытаецца надпіс: «У 1 дзень чэрвеня месяца ў лета ад нараджэння Хрыстова 1836 шчаслівага ж царствавання яго Імператарскай Вялікасці гасудара Імператара Мікалая Паўлавіча самадзержца Усерасійскага ў адзінаццатае па найвысачэйшаму загаду яго Імператарскай Вялікасці закладзены першы камень Брэст-Літоўскай крэпасці Галоўнакамандуючым дзеючай арміяй фельдмаршалам князем Варшаўскім графам Паскевічам Эрыванскім» [2, с. 149].

26 красавіка 1842 года пры ўрачыстых абставінах над крэпасцю 1-га класа быў падняты крапасны сцяг. Брэст-Літоўская крэпасць увайшла ў лік дзеючых крэпасцей Расіі. Яна складалася з Цытадэлі, размешчанай на востраве пры злучэнні Мухаўца і Буга і трох перадмаставых умацаванняў: Кобрынскага ў паўночным сектары, Валынскага ў паўднёвым сектары і Цярэспальскага ў заходнім сектары. Гэтыя ўмацаванні з вонкавага боку былі абаронены землянымі валамі дзесяціметровай вышыні (з казематамі і іншымі збудаваннямі ўнутры) і ровам перад імі, запоўненым вадой. Агульная даўжыня зямлянога вала дасягала 6,4 км.

Тэрыторыя Цытадэлі агароджвалася злучанай двухпавярховай абарончай казармай, якая мела выгляд прадаўгаватага многавугольніка з перыметрам каля 1,8 км. Вонкавыя цагляныя сцены казармы таўшчынёй каля двух метраў мелі амбразуры, а ўнутраныя сцены казармы вокны, Абарончая казарма складалася з 500 казематаў, у якіх маглі размясціцца да 12 000 салдат з неабходнымі запасамі боепрынасаў і прадуктаў. У заходняй частцы Цытадэлі быў узведзены будынак арсенала. На тэрыторыі былога аўгусцінскага кляштара ў цэнтры пабудавана гарнізонная царква. У былым калегіуме езуітаў размясціся каменданцкае і інжынернае ўпраўленні. Уніяцкая царква Пятра і Паўла пры базыльянскім кляштары была спачатку прыстасавана пад артылерыйскія казармы, а потым пад афіцэрскі клуб (у далейшым атрымала назву Белы палац). Чатырма брамамі — Брэсцкай, Холмскай, Цярэспальскай, Беластоцкай і мастамі Цытадэль злучалася з перадмаставымі ўмацаваннямі. Цярэспальскае ўмацаванне, якое размешчана на левым беразе Буга, складалася з чатырох земляных люнетаў, злучаных паміж сабою агульным ровам. Яно злучалася з Цытадэллю канатным мостам (самым вялікім на той час у Расійскай імперыі). Валынскае ўмацаванне складалася з двух бастыённых фартоў з двума равелінамі. У мужчынскім і жаночым бернардзінскіх кляштарах, якія існавалі тут з XVII стагоддзя, раскватараваўся ў 1841 г. брэсцкі Аляксандраўскі кадэцкі корпус, а з 1860 г. – вайсковы шпіталь. Кобрынскае ўмацаванне складалася з чатырох бастыённых фартоў з трыма равелінамі. Памяшканні былога кляштара брыгітак у заходняй частцы гэтага ўмацавання выкарыстоўваліся спачатку як казармы для прыгонных арыштантаў, а затым як турма. Сувязь перадмаставых умацаванняў з прылеглай да крэпасці мясцовасцю ажыццяўлялася: Цярэспальскага — праз Варшаўскі праезд, Валынскага – праз Паўднёвую браму і Кобрынскага – праз Усходнюю,

Паўночную і Паўночна-Заходнюю брамы. Брэст-Літоўская крэпасць з'яўлялася адной з лепшых крэпасцей таго часу: яна была вельмі добра размешчана на тэатры ваенных дзеянняў, цалкам адпавядала свайму прызначэнню тылавога апорнага пункта перадавога тэатра і мела магутныя ўмацаванні, якія адпавядалі апошнім патрабаванням таго часу. Аб важнасці Брэст-Літоўскай крэпасці гаворыць той факт, што цар Мікалай І за перыяд свайго царавання наведаў яе 7 разоў [2, с. 150]. Далейшыя работы па ўзмацненні крэпасці меркавалася прадоўжыць згодна зацверджанаму плану. Аднак, паколькі на 15 год (з 1848 па 1862) пабудова крэпасці па агульнаму праекту была ў асноўным спынена з-за адсутнасці грашовых сродкаў, то да 1863 г. яна ўжо не адпавядала свайму прызначэнню. Прыняцце на ўзбраенне ў другой палове XIX ст. большасцю краін наразной артылерыі, далёкасць дзеяння якой значна перавышала магчымасці гладкаствольнай артылерыі, патрабавала перабудовы крэпасцей, карэнных змяненняў у будове крапасных агарodж і ва ўзвядзенні вакол іх пояса асобных умацаванняў — фартоў. Штуршком для перабудовы крэпасцей з'явіўся вопыт Севастопальскай абароны 1854–1856 гг.

У 1862 г. вядомы рускі фартыфікатар, дырэктар інжынернага дэпартамента генерал-ад'ютант Э. І. Татлебен распрацаваў запіску аб мадэрнізацыі расійскіх умацаванняў у адпаведнасці з узросшай магутнасцю артылерыі. Гэтая запіска паслужыла на многія гады кіраўніцтвам для выканання далейшых абарончых работ і ў Брэсцкай крэпасці. У 1863 г. у крэпасць назначаецца пастаянны гарнізон ў складзе прыгоннага пяхотнага палка. У 1864 г. пачалася рэканструкцыя Брэсцкай крэпасці. Быў патоўшчаны галоўны вал, узведзены два рэдуты на Кобрынскім умацаванні, пабудаваны два парахавыя скляпы на 5 000 пудоў кожны, праводзіліся і іншыя работы. У 1869 г. для абстрэлу мясцовасці, якая закрыта насыпам Варшаўска-Брэсцкай чыгункі, Татлебен назначыў пабудову форта «Граф Берг».

Да 1869 г. Брэст-Літоўская крэпасць ўжо мела магутнае артылерыйскае ўзбраенне: гармат наразных – 312, гармат гладкаствольных — 286, марцір наразных – 30, марцір гладкаствольных – 129, усяго 757 гармат і марцір. У далейшым крэпасць удасканальвалася ў адпаведнасці са змяненнем прад'яўляемых да яе патрабаванняў. У маі 1876 г. у Брэст прыбыла камісія пад старшынствам генерала Обручава для стратэгічнага агляду мясцовасці. Яна намеціла пункты для ўзвядзення вакол крэпасці асобных перадавых умацаванняў. Два гады пазней інжынер-генералам Зверавым былі канчаткова ўдасканалены месцы для гэтых умацаванняў. План узмацнення крэпасці перадавымі ўмацаваннямі быў зацверджаны 18 лістапада 1878 г. У яго рамках намячалася пабудаваць 7 асобных фартоў на аддаленні 3–5 км ад агароджы крэпасці і 3–4 км адзін ад аднаго. Агульны абвод крэпасці меркавалася мець працягласцю 30 км. Будаўніцтва фартоў вялося 10 гадоў, з 1878 па 1888 гг. Усяго было ўзведзена 9 фартоў. Гэта былі земляныя ўмацаванні з размяшчэннем артылерыі на валах і з невялікімі казематамі для асабовага складу. Кожны форт дазваляў размясціць гарнізон колькасцю 250 чалавек і да 20 гармат. Фарты № 1, 2, 3 мелі сухія равы, а фарты № 4, 5, 6, 7, 8, 9 — равы, запоўненыя вадой. На будаўніцтва, аднаўленне і рамонт усіх відаў умацаванняў Брэст-Літоўскай крэпасці з 1833 па 1882 гг. было выдаткавана з будаўнічых сум ваенна-інжынернага ведамства каля 14 млн. рублёў [2, с. 151].

Далейшае развіццё артылерыі, у прыватнасці, з'яўленне фугасных снарадаў у сярэдзіне 80-х гадоў XIX ст. пры адначасовым павелічэнні яе дальнабойнасці, дало штуршок да новай перабудовы крапасных збудаванняў. Асабліва гэта паскорылася пасля руска-японскай вайны 1904–1905 гг.

Такім чынам, фартыфікацыйны комплекс Брэст-Літоўск у XIX ст. быў адным з магутнейшых ваенна-інжынерных збудаванняў Расійскай імперыі на яе заходніх рубяжах. Яго будаўніцтва даказвала тое, што дзяржава была гатова траціць вялікія сродкі, каб замацаваць за сабой далучаныя беларускія землі, і сведчыла пра асаблівую ўвагу, якую ўлады надавалі ўмацаванню новых заходніх рубяжоў Расійскай імперыі. Аднак, трэба зазначыць, што пры яе будаўніцтве было разбурана ці перабудавана 19 выдатных помнікаў культавай архітэктуры, грамадскіх і жылых будынкаў, ад чаго культура беларускіх зямель панесла вялікія страты, якія ўжо нельга было выправіць.

*Літаратура*

1. Несцярчук, Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л.М.Несцярчук. - 2-е выд., дап. — Мінск.: БЕЛТА, 2005. — 336 с.
2. Абрамаў, У.А. Крэпасць Брэст-Літоўск у 18–19 ст. / У.А. Абрамаў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Брэста. – У 2 кн. – Кн. 1. – Мінск: БЕЛТА, 1997. – С. 148–151.

## КОРОЛЕВСКАЯ ВЛАСТЬ РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ И БРЕСТСКАЯ ЦЕРКОВНАЯ УНИЯ

*Д.Ю. Прохоров, 2 курс магистратуры, факультет истории и права, СмолГУ, Смоленск*
*науч. рук. – Ю.Е. Ивонин, док. ист. наук, проф., СмолГУ*

Статья подготовлена в рамках исследовательского проекта Минобрнауки РФ «Мировая славистика в изучении новой и новейшей истории России и Беларуси: концепты славянского единства и самобытного развития в исторической ретроспективе», № 33.1419.2017/ПЧ.